Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (151), 2025

УДК [94(476)+37(476)(091)] “08/12” EDN: ETZJBZ

# Пераход ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці на беларускіх землях у IX–XIII стст. (Частка 1)

В.А. Пілецкі

Праведзена даследаванне пераходу ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці на беларускіх землях у IX–XIII стст. пад уплывам зараджэння дзяржаўнасці і хрысціянізацыі насельніцтва ўсходнееўрапейскага рэгіёну.

**Ключавыя словы:** традыцыйная адукаванасць, гістарычная трансляцыя грамадскага досведу, пісьме́ннасць насельніцтва, выхаваўча-адукацыйны працэс, кніжная адукаванасць.

A study has been conducted on the transition from traditional to book-based education in the Belarusian lands in the IX–XIII centuries under the influence of the emergence of statehood and the Christianization of the population of the Eastern European region.

**Keywords:** traditional education, historical translation of public experience, literacy of the population, educational process, book-based education.

**Уводзіны.** Цікава, ці былі адукаваныя людзі на тэрыторыі Беларусі да прыняцця хрысціянства? І да з’яўлення такой формы навучання, як «…*ученье книжное*…». Якая, згодна дадзеным старажытнага летапісу, узнікла на тэрыторыі Усходняй Еўропы разам з хрысціянізацыяй [1, с. 53]. Альбо, ці былі адукаваныя людзі ў дадзяржаўным перыядзе гісторыі нашай краіны (да IX ст.)? У той час, калі на этнаграфічна-беларускіх землях яшчэ не сфарміраваліся старажытныя першадзяржавы («княствы», ці «землі»: Полацкае, Тураўскае, Смаленскае)? І, адпаведна, не было яшчэ вядомай Кіеўскай Русі. Яна ўтварылася, згодна дадзеным «Аповесці мінулых гадоў», крыху пазней, пачынаючы з 882 г. [2, с. 10].

Канешне былі. Прычым з’явіліся ўжо за многа стагоддзяў раней да названых вышэй падзей. Таму што менавіта адукаваныя людзі (і, безумоўна, іх дзейнасць) – гэта аснова грамадскага прагрэсу. А ён, як вядома, уяўляе сабой цэнтральную (вызначальную) рысу грамадска-гістарычнай эвалюцыі чалавецтва. Ад пачатку яго гісторыі і да сённяшніх дзён. Без прагрэсу і пастрпальнай эвалюцыі не бывае гісторыі. Яна заўсёды накіравана ад элементарных (першабытных) да сучасных высокатэхналагічных форм жыццядзейнасці. Каб зразумець праблему наяўнасці адукаваных людзей у дапісьмовы перыяд гісторыі Беларусі, дастаткова ўспомніць сутнасць зместавага напаўнення тэрміна «адукава́насць».

Адукаванасць – гэта адна з якасцей асобы, «*...якая характарызуе здольнасць чалавека выкарыстоўваць у сваёй жыццядзейнасці асвоеныя ім прадукты матэрыяльнай і духоўнай працы людзей, гэта значыць іх мінулага досведу, і ўключаць іх у свой уласны досвед, кіруючыся дзеючымі сацыяльнымі нормамі і духоўнымі каштоўнасцямі ў грамадстве. На практыцы адукаванасць заключаецца ў аб'ёме інфармацыі (ведаў, уменняў, навыкаў), якая дазваляе правільна думаць у межах існуючай сістэмы ўяўленняў, разважаць, імкнуцца да дабра, ацэньваць наступствы сваіх дзеянняў. Адукаванасць вызначаецца ўменнем чалавека асэнсоўваць з'явы ўласнага духоўнага жыцця. Усё гэта, у канчатковым выніку, складваецца ў суцэльную карціну свету, у рамках якой “вызнае” сябе сам чалавек* ...» [3].

Інакш кажучы, адукаваны, гэта не абавязкова той, хто валодае навыкамі чытання, лічэння і пісьма, як мы прывыклі думаць у звычайным жыцці. Адукаваны чалавек – гэта той, які засвоіў культурныя набыткі сучаснага яму грамадства. Тыя, што маюцца ў гэтым грамадстве на момант жыцця дадзенага канкрэтнага чалавека. Тое, самае галоўнае, чым жыве гэтае грамадства ў названы гістарычны перыяд.

Другая частка зместу тэрміна «адукаванасць» заключаецца ў здольнасці чалавека (які засвоіў грамадскія набыткі) выкарыстоўваць іх у сваім паўсядзённым жыцці. Іншымі словамі, карыстацца імі ў матэрыяльных і духоўных адносінах. І самае апошняе – пашыраць (дапрацоўваць) атрыманы досвед падчас сваёй стваральнай дзейнасці, які пазней будзе перададзены новым пакаленням людзей.

Заўважым, што кожная гістарычная эпоха характэрная сваім тыпам (узроўнем і зместам) адукаванасці. Мы ўжо звярталіся да гэтага аднойчы, параўноўваючы адукаванасць «антычнага» і «сярэдневяковага» чалавека. [4, с. 25–35]. Вядомы і розныя іншыя даследаванні. Напрыклад, акадэмік РАА А.М. Новікаў ахарактарызаваў спецыфічныя рысы адукаванасці «індустрыяльнага» і «постіндустрыяльнага» тыпу грамадства (пра іх мы скажам ніжэй) [5]. Даследчыца з Кубанскага дзяржуніверсітэта В.У. Ягорава звярнула ўвагу на семантычныя асаблівасці тэрміна «education» (на матэрыяле часопіса «The Economist») [6] і г. д.

Гаворачы інакш, адукаванасць гэта тая колькасць ведаў і навыкаў у матэрыяльнай і духоўнай галінах жыццядзейнасці (прыдатная для засваення чалавекам), якой валодае кожнае (любое) грамадства, на кожным канкрэтным (любым) этапе сваёй гістарычнай эвалюцыі. Незалежна ад таго прысутнічае там пісьмо, лічэнне і чытанне ці не.

Напрыклад, у аснове «адукаванасці» першабытнага чалавека эпохі праабшчыны акрамя ведаў у галіне першабытных форм рэлігіі, міфалогіі, ведання ўнутрыабшчынных табу ды інш. ляжалі ўменні і навыкі загоннага палявання, збіральніцтва і рыбалоўства, якія давалі асноўную колькасць прадуктаў харчавання неабходных для фізічнага выжывання людзей.

Адукаваны чалавек эпохі феадалізму валодаў значна больш шырокай адукаванасцю, якая, акрамя сацыяльна-паводзінных і самазабеспячэнскіх (вытворчых) функцый уключала дактрынальныя веды (хрысціянскай, ці інш.) рэлігійнай сістэмы, а таксама навыкі чытання, лічэння, пісьма. І многія іншыя веды, якімі валодала грамадства на той час. Сучасны чалавек валодае яшчэ большым (па колькасці і якасці) зместам адукаванасці. Адпаведным рознаўзроўневаму досведу чалавецтва XXI ст., выпрацаванаму на дадзены перыяд.

Разам з тым, неабходна мець на ўвазе, што розныя грамадствы (у розных цывілізацыях, краінах, дзяржавах) маюць акрамя агульначалавечага (звязанага з гістарычным перыядам), свой уласны ўнікальны досвед, які служыць асновай адукаванасці любога канкрэтнага іх грамадзяніна. Прычым гэтая асобнасць мае месца нават тады, калі іх эвалюцыя ідзе адначасова (паралельна па часе) з грамадствамі іншых краін, дзяржаў, цывілізацый. У адзін і той жа гістарычны перыяд. Напрыклад, у XIX, XX, ці XXI стст.

Калі казаць пра дадзяржаўны перыяд у гісторыі любога народа, то ён самы працяглы. Ён часта ахоплівае не толькі стагоддзі, але і тысячагоддзі. Няўжо грамадства не мела адукаваных людзей і не развівалася ў гэты перыяд? Канешне ж, гістарычная эвалюцыя ішла непарыўна. Прычым яна мела прагрэсіўны характар. Кожнае новае пакаленне набывала досвед папярэднікаў, дадавала да яго свае дасягненні і рухалася наперад.

Такім быў (ёсць, і будзе заўсёды) непарыўны працэс грамадскай эвалюцыі, які абапіраецца на гістарычную трансляцыю досведу з пакалення ў пакаленне (інакш: выхаваўча-адукацыйны працэс) [7, с. 49–51]. *«Кожнае новае пакаленне не пачынае спазнання прыроды і грамадства спачатку, нанова, а грунтуецца на ведах папярэдніх пакаленняў і на аснове культурных дасягненняў мінулага пачынае сваё гістарычнае прасоўванне наперад…»* [8, с. 162]. Сказанае пацвярджаецца і зместам тэрміна «адукаванасць», пра які сказана вышэй.

Таму гаварыць пра адукаванасць, як гістарычную з’яву, неабходна найперш пачынаючы з разумення таго, што кожная гістарычная эпоха мае свой «воблік» адукаванасці. А зыходзячы з назвы дадзенай тэмы нашага даследавання, акрамя сказанага вышэй, неабходна яшчэ адрозніваць і перыяд гістарычнай (так званай «традыцыйнай») адукаванасці, ад кніжнай (альбо «кніжна-пісьмовай»), існаванне якой працягваецца і ў наш час.

Мэта артыкула. Паглыбленне навуковага разумення гістарычнага ракурсу дзеяння тэрміна «адукаванасць». Усталяванне ў свядомасць сучаснай навуковай грамадскасці адрознення двух відаў адукаванасці, якія маюць месца ў жыцці чалавецтва. «Традыцыйнай», існуючай у гісторыі любога грамадства і ў любы гістарычны перыяд, і «кніжна-пісьмовай», якая сфарміравалася пазней і паступова выцесніла разуменне паняцця «традыцыйная адукава́насць» з навуковага ўжытку. Прасачыць, прымяняльна да гісторыі насельніцтва тэрыторыі Беларусі, працэс пераходу ад аднаго да другога названых вышэй відаў адукаванасці. Паказаць, як на практыцы адбывалася змена прыярытэтаў у галіне гістарычнай трансляцыі грамадскага досведу (выхаваўча-адукацыйнага працэсу) у жыцці мясцовага насельніцтва пад уплывам зараджэння дзяржаўнасці і хрысціянізацыі.

Актуальнасць праблемы звязана з неабходнасцю паглыблення навуковага асвятлення гісторыі насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў галіне гістарычнай трансляцыі грамадскага досведу (выхаваўча-адукацыйнага працэсу). Якая з’яўляецца асновай прагрэсу ў сацыяльнай эвалюцыі чалавецтва. А яе вывучэнне і даследаванне дазваляе высветліць, у значнай ступені, вытокі сучасных соцыякультурных працэсаў.

Гістарыяграфія. Мы ўжо звярталіся да праблемы «адукава́насці», дакладней да яе адрознення ў антычны і сярэдневяковы перыяд гісторыі Еўрапейскага рэгіёна (і Беларусі ў тым ліку) [4, с. 25–35]. І адзначылі, што «*…гістарыяграфія заяўленай праблемы, акрамя прац якія характарызуюць сам тэрмін “адукава́насць”, мае дваякі выгляд* [9, с.8]. *З аднаго боку, маецца значная колькасць прац, якія вызначаюць “адукаванасць” насельніцтва ... у агульнакультурніцкім аспекце…*» [10]. «*...З другога боку, асноўная маса даследчыкаў, яшчэ з савецкіх часоў, разглядаюць інфармацыю, звязаную з узроўнем адукаванасці тых часоў, традыцыйна, у кантэксце гісторыі школы (альбо гісторыі выхавання і адукацыі)*» [11]. «*Што да прац з ... кампаратыўным характарам (падобна нашай), якія б ставілі задачу параўнання “адукаванасці” ў якасці асобнай .. з’явы, характэрнай для двух перыядаў (“антычнасці” і “сярэднявечча”), то такіх, нажаль, пакуль не было...*» [4, с. 25–35].

Тое ж, прыблізна, можна заўважыць і ў дачыненні да праблематыкі, заяўленай у прадмеце дадзенага даследавання. Працы для высвятлення семантыкі тэрміна адукаванасць маюцца, але там, нажаль, адсутнічае высвятленне праблематыкі пра наяўнасць гістарычнай («традыцыйнай») формы адукаванасці і яе суадносін з сучаснай «кніжна-пісьмовай». Так, даследчыца з Кубанскага ўніверсітэта В.У. Ягорава звярнула ўвагу на семантычныя асаблівасці тэрміна «education» (на матэрыяле часопіса «The Economist»). Але, у выніку даследавання гэтай чыста лінгвістычнай праблемы, яна прыйшла да цікавых высноў у зусім іншай, галіне: пра цяжкасці станаўлення Балонскага працэсу ў еўрапейскіх краінах (Германіі, Францыі, Італіі): «*Такім чынам, вывучэнне семантыкі паняцця “education” ... дазволіла выявіць праблемы, з якімі сутыкнуліся краіны ЕС пры пераходзе да Балонскага адукацыйнага працэсу... канстатаваць перавагу ацэначнай кампаненты як асноўнай у канататыўным (дадатковым – В.П.) значэнні (моўнай – В.П.) адзінкі…*» [6].

Цікавы аповед, які наглядна паказвае эвалюцыю «адукаванасці» як з’явы ў розных гістарычных умовах, прадставіў акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі А.М. Новікаў [5]. Дзе адзначыў, што кожнаму тыпу грамадства (у дадзеным выпадку: «індустрыяльнаму» і «постіндустрыяльнаму») адпавядае свой тып адукаванасці. Індустрыяльнаму адпавядае школа, створаная Я.А. Каменскім у XVII ст., накіраваная на масавую падрыхтоўку моладзі для працы ў якасці рабочых на масавай вытворчасці. Адукацыйныя інстытуты гэтага перыяду (школа, тэхнікум, ВНУ) выконвалі адпаведныя функцыі ў гэтым накірунку.

Новае «постіндустрыяльнае» грамадства, дзе веды становяцца капіталам і галоўным рэсурсам эканомікі, прад'яўляе свае патрабаванні да тыпу адукаванасці. «*Камуніка[-цыя]… канца XX ст. ... павялічыла хуткасць абмену інфармацыяй, а разам з тым і хуткасць прыняцця рашэнняў, дынаміку эканамічных, культурных, палітычных з'яў…*». Цяпер патрабуецца дынамічная, інакш «*бесперапынная*» адукацыя. «*...раней, чалавек вучыўся 10–15 гадоў, каб ... усё жыццё працаваць на ... (адным – В.П.) месцы…*». Цяпер «*... адукаванасць “старэе” настолькі хутка, што перавучвацца трэба пастаянна...*». А таму школа павінна даваць не толькі інфармацыю але і спосабы працы з ёю [5]. Усё вышэй адзначанае, безумоўна вельмі важна і сапраўды мае месца ў сучаснасці. І, канешне, патрабуе пільнай увагі адказных за ўзровень падрыхтаванасці моладзі грамадскіх структур.

Навуковых прац, прысвечаных яшчэ больш блізкай праблематыцы, альбо непасрэдна заяўленай намі праблеме «Пераходу ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці на беларускіх землях у IX–XIII стст.», мы, нажаль, не выявілі.

**Асноўная частка.** Кніжная пісьме́ннасць насельніцтва ў сучасным разуменні (інакш: адукаванасць, пабудаваная на ўменні чытаць, пісаць і лічыць), менавіта як сталая (масавая) з’ява гісторыі Беларусі узнікла разам з хрысціянізацыяй. Беларускі савецкі філосаф і гісторык Г.М. Філіст, які спецыяльна вывучаў праблему хрысціянізацыі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, заўважыў, што: «*...гістарычная сувязь паміж працэсам хрысціянізацыі і развіццём пісьменства ёсць …*». Але з «*...увядзеннем хрысціянства звязаны*

*не пачатак ... пісьменства, а яго працяг. Зараджэнне пісьменства абумоўлена не рэлігіяй. Любая з іх (рэлігій – В.П.) толькі выкарыстоўвала шматвяковы вопыт культурнага развіцця для сваіх мэтаў, выдаючы яго за свае дасягненні...*». «*У нашы дні ўжо няма сумненняў..., што пісьменнасць на Русі з'явілася задоўга да ўвядзення хрысціянства. Яе ўзнікненне абумоўлена ўнутранымі патрэбамі раннефеадальнай дзяржавы...*» [12, с. 81–83].

І сапраўды, гістарычная навука валодае markrознымі эпізадычнымі звесткамі аб дахрысціянскай кніжнай пісьмовасці. Якія так ці інакш характарызуюць гэтае пытанне. Напрыклад, пра славянскае пісьмо тыпу «чэрт і рэзаў». Аб ім сказана ў старажытным літаратурным творы «Аб пісьмёнах», напісаным невядомым аўтарам на пачатку X ст. [13]. Вядомы прыклады знаходак скандынаўскіх рунічных знакаў на тэрыторыі Беларусі. Так, «*...на месцы старажытнабеларускага горада Дарагічына (зараз на Беласточчыне) даследчыкі сабралі сотні свінцовых пломбаў (напэўна, гандлёвых пячатак X–XVI стст.), якія засталіся ад колішняй мытні, “варотаў на Захад”. На адным баку некаторых з гэтых пломбаў стаіць літара кірыліцы, на адваротным баку – адзін з загадказых знакаў.*

*На гарадзішчы Маскавічы каля Браслава ў пластах XII–XIII стст. акрамя скандынаўскіх рунічных надпісаў на костках знойдзены праселкі з літарападобнымі знакамі, якія, паводле класіфікацыі кіраўніка раскопак Л. У. Дучыц, падраздзяляюцца на 43 віды (гэта супадае з колькасцю літар у кірыліцы). Аналогіі ім вядомыя на рэчах з раскопак Менска, Ваўкавыска, Горадні, Ерсікі, Ноўгарада*» [14, с. 13–17]. Усё гэта сведчыць пра тое, што на тэрыторыі Беларусі да хрысціянізацыі былі нейкія спосабы перадачы інфармацыі.

Апасродкаваны доказ пэўнага распаўсюджання кніжна-пісьмовай культуры ў раннедзяржаўных утварэннях тэрыторыі Беларусі (дахрысціянскага перыяду) вынікае таксама з Дагавора з грэкамі (907 г.). У тэксце Лаўрэнцьеўскага спісу «Аповесці мінулых гадоў» сказана, што Полацк разам з іншымі гарадамі Русі (удзельнікамі паходу на сталіцу дзяржавы) атрымаў права на даніну з Візантыі. Якая павінна была «*...дань даяти на 2000 кораблій, по 12 гривне на человека, а вь корабли по 40 мужь...*» [15, с. 3]. А гэта значыць, што атрыманыя сродкі хтосці (на тэрыторыі Беларусі) падлічваў. Нейкія службовыя асобы, што валодалі навыкамі лічэння і пісьма, размяркоўвалі іх з дазволу князя на дзяржаўныя патрэбы.

Усё гэта так. Але, калі гаварыць пра масавую пісьме́ннасць («кніжную» адукаванасць) насельніцтва, то яна пачынаецца пасля хрысціянізацыі. Хоць хрысціянства тут і не было «пачынальнікам». Яно хутчэй ажыццяўляла працяг (як мяркуе Г.М. Філіст), было «паскаральнікам» працэсу рэтрансляцыі такой важнай з’явы, як кніжная адукаванасць.

Што можна сказаць пра «адукаванасць» як гістарычную з’яву да з’яўлення спосабаў графічнай перадачы інфармацыі? Якой яна была ў той час, калі жыхары тэрыторыі Беларусі яшчэ не ведалі кніжнай адукаванасці?

Вядома, што пачынаючы з самых старажытных часоў у гісторыі чалавецтва (і на тэрыторыі ўсходнееўрапейскага рэгіёна, а значыць і Беларусі ў тым ліку) падрыхтоўка моладзі да дарослага жыцця ажыццяўлялася ў выглядзе гістарычнай трансляцыі грамадскага досведу праз ініцыяцыі. Традыцыйныя формы падрыхтоўкі распаўсюджваліся на ўсіх (без выключэння) падлеткаў першабытнай абшчыны адпаведнага ўзросту і не прадугледжвалі засваення навыкаў чытання, лічэння і пісьма. Звесткі пра іх у культуры тагачаснага грамадства адсутнічалі.

Насельніцтва ўсходнееўрапейскага абшару [16, с. 58], як і тэрыторый іншых рэгіёнаў [17, p. 256] сусветнай айкумены на завяршальным этапе першабытнага ладу праводзіла сацыялізацыю моладзі шляхам полава-ўзроставых ініцыяцый [18, с. 92]. Дзе галоўнае месца ў падрыхтоўцы мелі фізіялагічныя якасці, здольнасць займацца вытворча-здабытковай дзейнасцю, засвойваць племянную абраднасць, дэманалогію, рэлігійна-міфалагічныя ды іншыя набыткі культуры тагачаснага чалавецтва.

Асобныя змены ў працэсе рэтрансляцыі грамадска-гістарычнага досведу новым пакаленням адбыліся падчас разлажэння першабытна-абшчыннага ладу, напярэдадні хрысціянізацыі. У сацыяльна-эканамічных і палітычных адносінах грамадства тых часоў ужо не было аднародным. Яно падзялілася на саслоўна-класавыя катэгорыі. А ў свядомасці насельніцтва ўсходнеславянскіх тэрыторый канчаткова ўсталявалася язычніцтва.

Змест адукаванасці з гэтых часоў акрамя ведання шматлікай колькасці багоў («адказных» за паасобныя бакі жыцця грамадства), духаў, культаў прашчураў, дэманалогіі; рэлігійнай, вытворчай ды інш., абраднасці ўключаў ужо значную колькасць ведаў і навыкаў, якія ранжыраваліся ў адпаведнасці з сацыяльным статусам і асноўным відам дзейнасці саслоўна-прафесійных груп насельніцтва.

Раней усё першабытна-абшчыннае грамадства мела адзін і той жа змест адукаванасці. Усе (любыя) падлеткі, акрамя хворых і фізічна або разумова-псіхалагічна недаразвітых, у абавязковым парадку праходзілі падрыхтоўку і ініцыяцыйныя выпрабаванні.

Гэта азначала набыццё імі вызначанага пераліку досведных каштоўнасцей (зместу адукаванасці), зацверджаных традыцыйнай сацыяльнай практыкай. І з’яўлялася «пропускам» у кола дарослых (праваадказных) грамадзян, якія мелі права заводзіць сям’ю і ўдзельнічаць у справах родавага калектыву. Вырашаць іншыя сацыяльна-адказныя задачы.

Цяпер, пасля з’яўлення саслоўна-класавага падзелу на прафесійныя катэгорыі, адукаванасць размяркавалася адпаведна сацыяльнаму статусу. Перадача прафесійна-каштоўнасных якасцей падрастаючым пакаленням цяпер адбывалася ўжо ў межах асобных сацыяльна-прафесійных (саслоўна-класавых) аб’яднанняў.

Кожнае з саслоўяў мела свае формы падрыхтоўкі падлеткаў і свой змест. Але кніжная адукаванасць да выхаваўча-адукацыйнага працэсу (гістарычнай трансляцыі грамадскага досведу) у той час яшчэ ніяк не адносілася. Нават на пачатковым этапе пасля хрысціянізацыі. Можна было быць выдатным прафесіяналам, напрыклад, майстрам-кавалём (збраёўнікам), пекарам ці ганчаром, але не ўмець ні пісаць, ні чытаць ці лічыць.

Перадаваліся ў той час выключна прафесійныя якасці і саслоўна-культурныя набыткі мінулых пакаленняў. Прычым адбывалася гэта, як правіла, у межах сваёй сацыяльна-прафесійнай групы. Часцей за ўсё па схеме: «ад бацькі – да сына».

Раннекласавае грамадства на тэрыторыі Беларусі, як вядома, падзялялася на чатыры асноўныя сацыяльныя групы [19, с. 3–32]: сяляне-абшчыннікі, рамеснікі, племянная знаць, што паступова феадалізавалася, і язычніцкія жрацы. Усе яны мелі сваю спецыфіку выхавання падлеткаў, звязаную з прафесійнай дзейнасцю.

Набор ведаў і навыкаў, якія перадаваліся, у кожнай з іх вызначаўся тымі якасцямі, якія былі патрэбны для ідэальнага прадстаўніка канкрэтнай сацыяльнай групы. Жрацы павінны былі ведаць прамудрасці сацыяльна-ідэалагічнага зместу (магія, лячэнне ад хвароб, уменне «размаўляць» з багамі і духамі) ды іншыя прыёмы, якія стабілізавалі грамадства і трымалі жыццё насельніцтва ў межах традыцыйных маральных норм і звычаёвага права [20, с. 3–12].

Нашчадкі рода-племяннной знаці (зародка феадальнага саслоўя) набывалі навыкі для арганізацыі абароны паселішчаў ад непрыяцеляў, выканання ваенна-паліцэйскіх функцый, удзелу ў вечавых органах і фарміравання феадальных землеўладанняў, ды інш.

Сялянска-рамесніцкае асяроддзе займалася вытворчай дзейнасцю і гэтаму навучала сваіх дзяцей. Жыццёва-практычны земляробчы і жывёлагадоўчы вопыт, веданне ўласцівасцей прыродных матэрыялаў, раслін, ды іншыя хітрасці сялянскай мудрасці.

Карэнны ўплыў на змену форм перадачы грамадска-гістарычнага досведу падлеткам (інакш: выхаваўча-адукацыйны працэс) у IX–XIII стст. зрабілі два важнейшыя фактары: зараджэнне дзяржаўнасці на протабеларускіх землях і хрысціянізацыя насельніцтва ўсходнееўрапейскага рэгіёна.

Яны на той час былі самымі важнымі спецыфічнымі рысамі развіцця грамадства. Працэсамі, якія фактычна змянілі формы і змест гістарычнай трансляцыі грамадскага досведу. Цалкам скарэкціравалі падрыхтоўку моладзі. І, па-сутнасці, азнаменавалі новы этап у гісторыі насельніцтва ўсходнееўрапейскага рэгіёну (і Беларусі ў тым ліку). Менавіта пад іх уплывам і пачаўся пераход ад «традыцыйнай» да «кніжна-пісьмовай» адукаванасці.

Перадумовы беларускай дзяржаўнасці, як вядома, узніклі задоўга да з’яўлення ў IX ст. Полацкага, Тураўскага і Смаленскага княстваў – першых тэрытарыяльна-палітычных аб’яднанняў этнаграфічна-беларускага арэала. Ужо «*з V ст. (н.э. – В.П.)*», па меркаванні сучасных вучоных, на тэрыторыі Беларусі пачынае назірацца «*...этнакультурная*

*стабільнасць і зараджэнне асноў дзяржаўнасці…*» [21, с. 11]. А ў канцы X ст. (992 г.), адпаведна дадзеным беларускага экзархата [22], на тэрыторыі Беларусі ўжо зафіксавана першая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка хрысціянскай царквы Полацкая епархія.

Распаўсюджване хрысціянства па тэрыторыі Беларусі, як адзначаюць многія даследчыкі, мела свае значныя асаблівасці [23, с. 342–347]. Нездарма ў гістарычных крыніцах зусім адсутнічаюць звесткі аб факце адначасовага хрышчэння насельніцтва Полацка [24]. Так, напрыклад, як гэта было ў Кіеве. А сам працэс хрысціянізацыі расцягнуўся на даволі працяглы перыяд (ажно да XIII–XIV стст.) [25]. Вядомы таксама і доказы панавання ў грамадскай свядомасці пасля хрысціянізацыі яўнага сінкрэтызму [26, с. 181–183], не ліквідаванага цалкам ажно да нашых дзён. І тым не менш настойлівасць феадальнай улады ўрэшце прывяла да панавання хрысціянскай культуры ў розных сферах жыцця грамадства [27, с. 14–51]. Не заўважыць гэта нельга і ў гістарычнай трансляцыі досведу.

У перыяд X–XIII стст. на выхаваўча-адукацыйнай прасторы Беларусі з'явілася новая (хрысціянская) форма падрыхтоўкі дзяцей. У летапісных крыніцах яна атрымала назву «*вучэнне кніжнае*» [1, с. 53]. Гэта былі ўсходнехрысціянскія (візантыйска-праваслаўныя) рэлігійна-ідэалагічныя школьна-палітычныя ўстановы. Важнейшай мэтай, якая ўскладвалася на іх царквой, была катэхізацыя (распаўсюджванне царкоўна-хрысціянскай дактрыны) у асяроддзі мясцовага насельніцтва.

Як і ў Заходняй Еўропе [28, p. 72], такое навучанне арганізоўвалася феадальнымі, рэлігійнымі і свецкімі палітычнымі ўладамі, зацікаўленымі ў хрысціянізацыі жыхароў сваёй краіны. Княжацкае кіраўніцтва «*…нача поимати…дети, и даяти… на ученье книжное…*» [1, с. 53]. Пры царкоўных установах (рознага ўзроўню), такім чынам, арганізоўвалася навучанне маладых людзей. У выніку паступова афарміліся прыходскія (царкоўныя, касцёльныя) альбо епіскапскія (біскупскія) школы. Гэта, часцей за ўсё, вырашалася насуперак волі шырокіх пластоў насельніцтва, аб чым сведчыць тая ж летапісная крыніца: «*Матере же чадъ сихъ плакахуся по нихъ, … но акы по мертвеци плакахся…*» [1, с. 53].

Акрамя катэхізацыі гэтае «вучэнне» мела важную рэлігійна-палітычную (кадравую) мэту. Яно было накіравана на падрыхтоўку прыходскіх святароў ды іншых прадстаўнікоў ніжэйшага звяна царкоўна-ідэалагічнай іерархіі. Ва ўмовах інтэнсіўнага распаўсюджвання ўплыву хрысціянскай царквы на новыя еўрапейскія тэрыторыі патрэбна была значная колькасць царкоўных функцыянераў з ліку мясцовага насельніцтва розных рэгіёнаў.

Задачы стварэння вышэй названых устаноў, такім чынам, былі наступныя: а) распаўсюджванне ўсходнехрысціянскай (пасля 1054 г. – «праваслаўнай») дактрыны; б) фарміраванне сацыяльнай базы царквы як апоры феадалізму ў асяроддзі мясцовага насельніцтва; в) падрыхтоўка царкоўных служачых нізавога звяна; г) барацьба з язычніцтвам і традыцыйнымі формамі трансляцыі досведу новым пакаленням папярэдняга перыяду.

(*працяг у наступным нумары*)

## Літаратура

1. Повесть временных лет / РАН ; подгот. текста, пер., статьи и коммент. Д. С. Лихачева ; под ред. В. П. Адриановой-Перетц. – СПб. : Наука, 2007. – 668 с.

2. Лаврентіевская летопись (гг. 6388–6406) // ПСРЛ. – СПб. : Тип. Эдуарда Праца, 1846. – Т. 1 : Лаврентіевская и Троицкая летописи. – 267 с.

3. Образованность [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://goo.su/yqMC. – Дата доступа : 08.01.2025.

4. Пілецкі, В. А. Пра адрозненне антычнай і сярэднявечнай адукаванасці / В. А. Пілецкі // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сер., Гум. навукі. – 2024. – Т. 69, № 1. – С. 25–35.

5. Новиков, А. М. Понятие «образованность» в постиндустриальном обществе [Электронный ресурс] / А. М. Новиков. – Режим доступа : https://goo.su/YtlK6. – Дата доступа : 19.10.2024.

6. Егорова, В. В. Семантические особенности понятия «education» (на материале журнала «The Economist») [Электронный ресурс] / В. В. Егорова. – Режим доступа : https://goo.su/K379oX1. – Дата доступа : 25.02.2025.

7. Пілецкі, В. А. Выхаваўча-адукацыйны працэс як гістарычная катэгорыя / В. А. Пілецкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 8. – С. 49–52.
8. Анисимов, А. Ф. Духовная жизнь первобытного общества / А. Ф. Анисимов. – Л. : Наука, 1966. – 244 с.
9. Биери, П. Что значит быть образованным человеком? Речь на открытии Педагогического колледжа в Берне / П. Биери // Отечественные записки. – 2008. – № 1 (40). – С. 8.
10. Гуревич, А. Я. Проблемы средневековой народной культуры / А. Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1981. – 359 с.
11. Школа и педагогическая мысль средних веков, Возрождения и начала нового времени : сб. науч. тр. / Под ред. К. И. Салимовой, В. Г. Безрогова. – М. : АПН СССР, 1991. – 285 с.
12. Филист, Г. М. Введение христианства на Руси : предпосылки, обстоятельства, последствия / Г. М. Филист. – Минск : Беларусь, 1988. – 254 с.
13. Сказание о письменах черноризца Храбра (X в.) [Электронный ресурс] / пер. В. Я. Дерягина. – Режим доступа : https://goo.su/iXSRd. – Дата доступа : 05.01.2025.
14. Зайкоўскі, Э. М. Калі на Беларусі з’явілася пісьмо? /Э. М. Зайкоўскі // Спадчына. – 1992 – № 2. – С. 13–17.
15. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах / Склалі: акадэмік В. К. Шчарбакоў, дацэнт К. І. Кернажыцкі і вучоны археограф Д. І. Даўгяла. – Мінск : Выд. Акадэміі навук БССР, 1936. – Т. 1 : IX–XVIII стст. – 678 с.
16. Балушок, В. Г. Инициации древних славян (попытка реконструкции) / В. Г. Балушок // Этнографическое обозрение. – 1993. – № 4. – С. 57–66.
17. Loeb, E. M. Tribal initiations and secret societies / E. M. Loeb. – Los Angeles : University of California, 1929. – 290 p.
18. Тендрякова, М. В. Первобытные возрастные инициации в круге «вечных» вопросов / М. В. Тендрякова // Этнографическое обозрение. – 2014. – № 1. – С. 91–101.
19. Пілецкі, В. А. Гісторыя культуры Беларусі. Вучэбны дапаможнік для студэнтаў негістарычных факультэтаў ВНУ / В. А. Пілецкі. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : МІУ, 2019. – 402 с.
20. Пілецкі, В. А. Змест выхаваўча-адукацыйнага працэсу дахрысціянскай Беларусі / В. А. Пілецкі // Гісторыя : праблемы выкладання. – 2004. – № 3. – С. 3–12.
21. История белорусской государственности : в 5 т. / А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Бел. наука, 2018. – Т.1 : Белорусская государственность : от истоков до конца XVIII в. ; отв. ред. тома : О. Н. Левко, В. Ф. Голубев ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – 598 с.
22. Распространение христианства… [Электронный ресурс] // Официальный портал БПЦ. – Режим доступа : https://goo.su/ueZHqx. – Дата доступа : 04.02.2025.
23. Крещение Полоцкой земли / О. М. Рапов // Русская церковь в IX – первой трети XII в. Принятие христианства. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Русская панорама, 1998. – 416 с.
24. Тарасаў, С. В. Прылучэнне да хрысціянства/ С. В. Тарасаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 34–42.
25. Богданович, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А. Е. Богданович // Этнографический очерк. – Гродно : Губернаская типография, 1895. – 186 с.
26. Пілецкі, В. А. Дваяверства як адзін з вынікаў спецыфікі хрысціянізацыі насельніцтва Беларусі / В. А. Пілецкі // Управление в социальных и экономических системах : матер. XXIII Междунар. науч.-прак. конф., Минск, 15 мая 2014 г. / МИУ. – Минск, 2014. – С. 128–130.
27. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 444 с.
28. Viriville, V. L’instruction publique en Europe et principalement en Franse depuis le creistianisme jusqu’a nos jours. Universités, colléges ecoles des deux sexes, académies, bibliothèques publiques, etc. / V. De Viriville. – Paris : Administration du Moyen age et la Renaissance, 1848. – 400 p.

Институт истории НАН Беларуси Поступила в редакцию 21.03.2025